# Ніхто не забыты, нішто не забыта

***Жывая памяць аб гераічных пакаленнях***

Сучасныя школьнікі ведаюць пра вайну толькі з урокаў гісторыі, твораў мастацкай літаратуры ды кінафільмаў. Усё менш і менш застаецца сведкаў, якія могуць расказаць пра подзвіг народа. Памяць аб тых, хто прайшоў праз жахі вайны, увекавечана ў помніках і абелісках.



У дзяржаўнай установе адукацыі “Мікалаеўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад- сярэдняя школа імя Якуба Коласа” даўно вядзецца работа па захаванні і ўшанаванні памяці аб тых векапомных гадах. Піянеры дружыны імя Якуба Коласа, члены пярвічнай арганізацыі БРСМ, якія адначасова з’яўляюцца членамі краязнаўчага аб’яднання па інтарэсах, узялі шэфства над помнікам загінуўшым аднавяскоўцам, помнікам Ношка Натану і 28 партызанам, які ўстаноўлены недалёка ад в. Паласня.





**Работа вядзецца пад кіраўніцтвам Каранеўскай Таццяны Леанідаўны, педагога –арганізатара, і Хвалей Таццяны Уладзіміраўны, кіраўніка турысцка-краязнаўчага аб’яднання па інтарэсах.**

Менавіта падчас такой сумеснай дзейнасці, пошукавай работы, высветлілася, што зусім недалёка ля вёскі Мархачоўшчына знаходзіцца месца пахавання салдат, што былі расстраляны яшчэ ў пачатку вайны. Аб гэтым расказалі мясцовыя жыхары Хвалей Ніна Анатольеўна і Хвалей Сяргей Іосіфавіч.



У далёкім 1941 годзе Сяргею Іосіфавічу было толькі 10 гадоў, але ён добра памятае тыя жахлівыя падзеі. Суразмоўца расказаў аб тым, што фашысты расстралялі двух савецкіх салдат, якіх ноччу пахаваў яго бацька.

Невядомых месцаў пахавання салдат вайны быць не павінна. Таму абазначылі гэта месца памятным знакам. Але ўстанавіць яго непасрэдна там, дзе воіны былі пахаваны, не змаглі, бо яно зараз знаходзіцца на калгасным полі.

Менавіта па гэтай прычыне аднеслі памятны знак бліжэй да дарогі, каб кожны змог спыніцца і аддаць даніну памяці загінуўшым.








Аднак работа ў гэтым накірунку не абмяжоўваецца толькі шэфствам над вышэйназванымі помнікамі. Вучні здзяйсняюць велапаходы па памятных месцах роднай Стаўбцоўшчыны і ўжо даведаліся пра гісторыю помнікаў у в.

Вішнявец, здзейснілі велапаход па мясцінах славы ў в. Новы Свержань, г. Стоўбцы.

Не засталіся без увагі і сумныя старонкі гісторыі. Наведалі яўрэйскія могілкі ля в. Новы Свержань.



Ушаноўваючы памяць аб загінушых, не забываюць вучні і пра жывых сведкаў ваенных ліхалеццяў: наведваюць Мікалаеўшчынскі дом-інтэрнат для ветэранаў вайны, працы і інвалідаў, ладзяць канцэрты, віншуюць іх са святамі - Днём пажылых людзей, Днём Перамогі, Новым годам.




Гады ідуць, адыходзяць у вечнасць тыя, хто здабываў нам мір. А мы павінны паспець пачуць тых, хто яшчэ побач з намі, хто прайшоў доўгімі дарогамі вайны – ветэранаў вайны. Піянеры і члены БРСМ з’яўляюцца шэфамі ветэранаў вайны.

Іх у Мікалаеўшчыне засталося толькі двое **: Лосик Михаил Михайлович на фото слева и Валько Михаил**

**Михайлович, на фото справа.** Вучні наведваюць ветэранаў дома, а напярэдадні вельмі адметнага для іх свята, Дня Перамогі, сустрэчы асабліва ўрачыстыя .

**І праз гады не павінны людзі забываць тых, дзякуючы каму мы жывём у мірнай краіне, маем магчымасць будаваць планы на будучае.**

